# Весці

## Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс. Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 2 (40) 2004

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

*Галоўны рэдактар:*
П. Дз. Кухарчык

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
В. А. Бондар
*(нам. галоўнага рэдактара)*
В. В. Бушчык
Ю. А. Быкадораў
*(нам. галоўнага рэдактара)*
М. С. Вайтовіч
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Л. М. Давыдзенка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
П. В. Кікель
Н. І. Копысава
*(адказны сакратар)*
Г. А. Космач
А. М. Люты
І. А. Новік
А. У. Рагуля
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
М. Т. Стэльмашук
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. Г. Ясавееў
М. С. Яўневіч

## Змест

***Гісторыя***

**Да 60-годдзя вызвалення Беларусі**

*Караткевіч А. Ц.* Навечна ў памяці народнай ... 3
*Каваленя А. А.* Аперацыя «Баграціён» ... 5
*Валчок Г. І.* Узаемадзеянне партызан Магілёўскай вобласці з часцямі Чырвонай арміі ў ходзе беларускай наступальнай аперацыі... 7
*Канапацкі І. Б., Шкуцько Л. Л.* Садружнасць народаў СССР у перыяд вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў .... 10
*Кузьменка У. І.* Інтэлігенцыя ў антыфашысцкай арганізацыйнай і палітычнай рабоце ў перыяд вызвалення Беларусі ... 11
*Жылінскі М. Г.* Арганізацыя і праца савецкіх школ на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны... 15

◊ ◊ ◊

*Мацюш П. А.* Навуковыя і навукова-педагагічныя кадры гісторыкаў Беларусі: дынаміка колькаснага росту ў 60 — пачатку 70-х гг. XX ст. ... 21
*Пілецкі В. А.* «Гамераўскія» мужчынскія саюзы як адзін з элементаў фарміравання выхаваўча-адукацыйнага працэсу эпохі антычнасці ... 23
*Лапановіч С. Ф.* Дзейнасць Таццянінскага камітэта па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны... 26
*Фядковіч Г. І.* Дзейнасць балгарскіх інтэрнацыяналістаў у Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайне ... 29
*Сямёнава С. А.* Роля купецтва ў развіцці гандлю, прамысловасці і фінансаў Беларусі ў другой палове XVIII — першай палове XIX ст...... 31
*Крывуць В. І.* Удзел Войска Польскага ў рэалізацыі ўрадавай маладзёжнай палітыкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 30-х гг. XX ст. ... 35
*Важнік В. М.* Беларуска-польскае эканамічнае і гандлёвае супрацоўніцтва ў 50—70-х гг. XX ст. ... 38

***Філасофія***

*Кікель П. В., Маркіянава Н. П.* Выхаванне як аснова станаўлення будучага спецыяліста ... 42
*Бліхарж Р. І.* Функцыі метадалагічных ведаў у навуковым даследаванні ... 45

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

УДК 947.6

І. Б. Канапацкі, Л. Л. Шкуцько

# САДРУЖНАСЦЬ НАРОДАЎ СССР У ПЕРЫЯД ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны супраць гітлераўскіх захопнікаў разгарнулася жорсткая барацьба, у якой прымалі ўдзел усе народы СССР. У складзе Чырвонай Арміі дзейнічалі гвардзейскія казахскія дывізіі, эстонскі корпус, латышская і літоўская дывізіі і інш. Толькі ў склад генералітэту і афіцэрскага саставу ўваходзілі прадстаўнікі больш 50 нацыянальнасцей, у тым ліку выдатныя военачальнікі — ураджэнцы Беларусі В. Д. Сакалоўскі, А. Г. Антонаў, І. І. Якубоўскі, С. А. Красоўскі, А. Р. Бацюня і інш.

Сярод 11603 воінаў — Герояў Савецкага Саюза было 8160 чалавек рускіх, 206 украінцаў, 443 беларусы, у тым ліку 8 дачок нашага народа — Е. Зянькова, А. Мазанік, А. Маслоўская, А. Стэмпкоўская, З. Тусналобава; 161 татар, 108 яўрэяў, 16 казахаў, 90 грузінаў, 40 армян, 69 узбекаў, 61 мардвін, 44 чувашы, 44 азербайджанцы, 39 башкіраў, 32 асецінцы і г. д. Больш за 300 прадстаўнікоў розных народаў паўтаралі подзвігі А. Матросава і М. Гастэлы, за 600 здзейснілі паветраны таран. Сярод двойчы Герояў Савецкага Саюза былі 4 беларусы — П. Я. Галавачоў, С. І. Грыцавец, І. І. Гусакоўскі, І. І. Якубоўскі, а таксама прадстаўнікі іншых народаў — С. Амет Хан, І. Х. Баграмян, І. А. Плієў, Ц. Ц. Хрукін, І. Д. Чарняхоўскі, А. К. Нядбайла і інш. [1, с. 520]. Героямі Савецкага Саюза сталі 88 падпольшчыкаў і партызан Беларусі, больш за 60 воінаў — ураджэнцаў рэспублікі — атрымалі Ордэн Славы трох ступеняў.

У партызанскіх атрадах супраць захопнікаў на тэрыторыі Беларусі побач з беларусамі (71,6 %) змагаліся рускія — 19,29 %, украінцы — 3,8 %, яўрэі — 2,8 %, а таксама літоўцы, латышы, грузіны, узбекі і іншыя прадстаўнікі шматнацыянальнай краіны (73 нацыі і народнасці).

Толькі ў партызанскай брыгадзе «Разгром», якая дзейнічала ў Мінскай вобласці, было прадстаўлена больш за 25 нацыянальнасцей, у брыгадзе імя А. Ф. Данукалава на Віцебшчыне — 21, у партызанскім палку № 211 Магілёўскай вобласці — 25, а ў брыгадзе імя В. Чкалава ў Баранавіцкай вобласці змагаліся прадстаўнікі 29 нацыянальнасцей краіны. Камандзір брыгады М. І. Грыбанаў–рускі, камісар — беларус І. П. Казак, начальнік штаба — украінец І. П. Анішчанка, разведку ўзначальваў абхазец Д. К. Зухба, атрадамі камандавалі карачаевец К. Кінкееў і татарын В. Я. Шакіраў. У складзе брыгады змагалася 638 беларусаў, 292 рускія, 48 украінцаў, 107 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей [2, с. 50—51]. У той жа час на Украіне ваявалі з ворагам беларусы (да 6 % партызан).

Актыўнымі арганізатарамі і ўдзельнікамі барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў радах народных мсціўцаў былі прадстаўнікі рускага народа П. Канавалаў, Р. Такулееў, М. Канстанцінаў, украінцы — У. І. Цімчук, А. Нікалаеў, У. Шчарбіна, карачаевец А. Касоеў, казах Г. Ахмедзьяраў, таджык М. Таіраў і шмат іншых.

У летапісе славы беларускага народа перыяду ваенных гадоў ганаровае месца займае імя партызана — казаха Ж. Маматава. Сем ордэнаў і медалёў (у тым ліку ордэн Леніна) гавораць аб яго баявых подзвігах. У Кобрынскім раёне страх на гітлераўцаў наводзіла інтэрнацыянальная рота імя С. М. Кірава, якой камандаваў узбек Л. Уракаў. На баявым рахунку роты больш за 1600 забітых гітлераўцаў, 15 пушчаных пад адхон эшалонаў праціўніка. Усе байцы гэтай роты атрымалі ўрадавыя ўзнагароды, а камандзір — ордэн Чырвонай Зоркі і медаль «За адвагу» [3, с. 32].

Прадстаўнікі розных народаў і нацыянальнасцей удзельнічалі ў вызваленні рэспублікі: рускія — летчык, двойчы Герой Савецкага Саюза Я. Бяда, Героі Савецкага Саюза А. В. Гарбатаў, П. А. Ротмістраў, С. Д. Роман, паўтарыўшы подзвіг А. Матросава, А. Д. Асадчы і інш., украінцы — В. А. Супрун, С. П. Супрун, А. С. Бурдзейны, воінскія злучэнні якога першымі ўварваліся ў Мінск, П. М. Рак, танкавы экіпаж якога ў складзе рускіх А. Пятраева і А. Данілава першым уварваўся ў Барысаў і амаль усю ноч вёў бой з гітлераўцамі, яўрэі — І. С. Бесін, З. С. Гарэлік, тувінец М. А. Бухтуеў, мардвін І. В. Болдзін, узбек Дж. Асаналіеў і інш.

За баявыя подзвігі, здзейсненыя пры вызваленні Беларусі, 1631 воін атрымаў высокае званне Героя Савецкага Саюза. З іх 1162 рускія, 235 украінцаў, 39 беларусаў, 29 татараў, 26 казахаў, 20 узбекаў, 18 башкіраў, больш за 100 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. Сярод іх прадстаўнік рускага народа Ю. Смірноў, якога гітлераўцы параненага захапілі ў палон непадалёку ад Оршы і, не дабіўшыся ніякіх

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

звестак, распялі на сцяне бліндажа, К. Захараў, М. Калінін, А. Пятроў, украінцы П. Мірашнічэнка, К. Гнідаш, казах С. Іскаліеў, узбек Г. Якубаў і інш. [4, с. 27—30]. Прыкладна 402 тыс. воінаў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Пры вызваленні Беларусі Чырвоная Армія панесла вялікія страты, загінула больш за 600 тыс. чал., у тым ліку 522 Героі Савецкага Саюза, прадстаўнікі 29 нацыянальнасцей: рускія — У. Мартынаў, С. Роман, Б. Бахараў, украінцы — У. Карпенка, С. Супрун, туркмен — К. Азолаў, татарын — Т. Ібрагімаў, мардвін — П. Куманаў, чуваш — Г. Аляксееў, башкір — К. Ахметшын, беларус — П. Акуцыёнак і інш.

У той жа час 1,3 млн беларусаў змагаліся на франтах вайны. Многія з іх здзейснілі баявыя подзвігі пад Масквой і Ленінградам, Сталінградам і на Курскай дузе, пры вызваленні іншых рэспублік [5, с. 79]. За гераічныя подзвігі 4 прадстаўнікі Беларусі сталі двойчы Героямі Савецкага Саюза, 443 — Героямі Савецкага Саюза, больш 300 тыс. узнагароджаны ордэнамі і медалямі, 65 сталі поўнымі кавалерамі Ордэна Славы, 14 паўтарылі подзвіг А. Матросава; І. Авекаў, П. Муравіцкі, М. Пінчук здзейснілі паветраны таран, гамельчанін І. Катунін у 1944 г. паўтарыў подзвіг М. Гастэлы [6, с. 150].

Ураджэнка Расоншчыны З. Тусналобава за 8 месяцаў баявых дзеянняў вынесла з поля бою 128 параненых. У баях на Курскай дузе была цяжка паранена і абмарозілася, у выніку чаго страціла рукі і ногі. Нягледзячы на гэта і ў пасляваенны час яна займалася актыўнай грамадскай дзейнасцю, была ганаровым грамадзянінам г. Полацка. Атрымала вышэйшую ўзнагароду Міжнароднага Камітэта Чырвонага Крыжа медаль Флорэнс Націнгейл [7, с. 545].

Шматлікія з беларусаў, выконваючы свой свяшчэнны доўг, загінулі. Іх подзвігі пасмяротна ацэнены званнем Героя Савецкага Саюза. Так, у баях пад Ленінградам загінуў вядомы снайпер, ураджэнец Быхаўшчыны Ф. Смалячкоў. Абараняў Маскву ўраджэнец Віцебска, генерал Л. Даватар, на Курскай дузе здзейсніў свой подзвіг лётчык А. Гаравец, уступіўшы ў бой з 20 гітлераўскімі самалетамі, збіў 9. Пры абароне Крыма загінулі лётчыцы П. Гельман і Г. Дакутовіч, у баях за Украіну загінуў А. Волах, Латвію — П. Рубіс, П. Купрыянаў, Літву — Р. Кавалеў і г. д.

Многія прадстаўнікі рэспублікі ўдзельнічалі ў вызваленні сваіх родных мясцін, здзейсніўшы шматлікія подзвігі: ураджэнец Клічава танкіст П. Крыванос, з Міншчыны А. Чарныш, выхадзец са Жлобіншчыны М. Барташоў, ураджэнец г. п. Шуміліна П. Акуцыёнак і шмат іншых вядомых і невядомых герояў.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Т. 2.
2. *Ковшаров Н. Д.* Беларусь в годы Великой Отечественной войны (1941—1945). Мн., 1997.
3. *Иосько М. И.* Белоруссия и Узбекистан. Мн., 1970.
4. *Киселев Т. Я.* Советская Белоруссия. М., 1982.
5. *Ковшаров Н. Д.* Беларусь в годы Великой Отечественной войны (1941—1945). Мн., 1997.
6. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1997. Т. 4.
7. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 2001. Т. 6.



*SUMMARY*

*The article touches upon the military events during the liberation of Belarus, heroism of the representatives of all the nationalities of the USSR in the struggle against fascist invaders.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*УДК 947.6—057.85*

***У. І. Кузьменка***

# ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ Ў АНТЫФАШЫСЦКАЙ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОЦЕ Ў ПЕРЫЯД ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ

Разам з усім народам у вызваленчай антыфашысцкай барацьбе на акупіраванай нацыстамі тэрыторыі Беларусі актыўна ўдзельнічала інтэлігенцыя рэспублікі. Гэта сацыяльная група насельніцтва, нягледзячы на ўсю складанасць яе передваеннага лёсу ў БССР, у сваёй падаўляючай большасці зрабіла выбар на карысць змагання супраць гітлерызму, не скарылася ворагу. Тым больш, што ў яе складзе было шмат асоб палітычна актыўных, што мел... дачыненне да грамадскага жыцця краіны канца 30 — пачатку 40-х гг. XX ст., уваходзіл... ў склад кампартыі і камсамола. Гэта прадвыз... начыла іх шлях барацьбы супраць нямецка... фашысцкіх акупантаў. У рады савецкіх пар... тызанскіх атрадаў, брыгад і злучэнняў у 1941—1944 гг. у Беларусі ўлілося больш за 20 тыс. прадстаўнікоў мясцовай інтэлігенцы... [1].